# ВУЧОНЫ КОТ

***Словы А леся Пісьмянкова*** ***Музыка Валянціна Каваліва***




Са шчасцем заручоны, жыву не першы год,
Бо я ёсць кот вучоны, бо я не проста кот,
Бо я ёсць кот вучоны, я ёсць кот вучоны,
Бо я ёсць кот вучоны, бо я не проста кот.

Рэпазіторый БДПУ

Прыпеў: Калі ў цябе бяда -
Звяртайся да ката:
Вучонаму кату
І мора па пяту!

Са мной сябруюць дзеці ўжо каторы год,
Бо я адзін у свеце такі вучоны кот,
Бо я адзін у свеце, я адзін у свеце,
Бо я адзін у свеце такі вучоны кот.

Прыпеў:

У маёй вясёлай школе і ты б вучоным стаў,
У гэтай школе колісь твой тата падрастаў,
У гэтай школе колісь, у гэтай школе колісь,
У гэтай школе колісь твой тата падрастаў.

Прыпеў: Калі ў цябе бяда -
Звяртайся да ката:
Вучонаму кату
І мора па пяту!

Репозиторий БГПУ